ЗЯЛЁНЫ РАДОК

# Услухоўвайцеся ў голас натхнення…



Назаўсёды запомніліся словы майго паэтычнага настаўніка Алега Антонавіча Лойкі, якому нясмела паказвала свае першыя паэтычныя радкі. Ён сказаў: «Услухоўвайцеся ў голас натхнення. Натхненне жыве ў душы». Часта згадваю гэтыя словы, калі сама сустракаюся з тымі, хто робіць свае першыя творчыя крокі. Звычайна гэта ўдзельнікі літаратурных конкурсаў і алімпіяд. Вось і гэтыя першыя паэтычныя радкі належаць адданым прыхільніцам мастацкай літаратуры, якія яшчэ толькі-толькі ўслухаліся ў голас натхнення.

**Алена РУЦКАЯ**

**Анастасія Грыб**
**вучаніца 9 "Б" класа СШ № 40**

*******

О Беларусь! Мой мілы Край! Мая Радзіма!..
У гэтых словах шчасны лёс майго жыцця.
Дзе б ні была, кажу пра вернасць пачуцця:
О Беларусь! Мой мілы Край! Мая Радзіма!..
Тут для мяне нішто не мае забыцця,
Тут – мае продкі, далягляды, успаміны...
О Беларусь! Мой мілы Край! Мая Радзіма!
У гэтых словах шчасны лёс майго жыцця.

**Ганна Блажэвіч**
**вучаніца 10 "Б" класа, Гімназія № 9 імя Ф. П. Кірычэнкі**

# Чаканне свята

Мы чуем, як святы ўжо набліжаюцца:
У крамах на зніжцы кальмары, ікра.
І фільм "Адзін дома" для дзетак ўключаецца...
Іісуса чакае самотна царква.

І ўсё гэтак добра – і горад смяецца.
Прысмакі тут,  елачкі і мішура,
Канцэрты, а моладзь па лёдзе нясецца...
Іісуса чакае з надзеяй царква.

Хай музыка льецца, а шчасце імкнецца
Зайсці ў кожны дом, адзяліць нездарма:
Бо душы ачысцім і кожнае сэрца
Іісуса чакае, чакае царква.

**Виктория Машуто**
**Гродненский политехнический колледж**

# К н и г е

Возьми же книгу, что грустит в  пыли,
Страницы старые  тихонько разверни,
Начни читать – и целый мир открыт,
И время, незамеченным летит.

Там ширь степей; полей, лугов простор,
Глухая тишь пустынь, величье гор.
Хранит там судьбы старый городок,
Кареты звонкий стук, людской поток,
Раскошные наряды гордых дам...
Как наяву ты побываешь там.

Возьми же книгу, что грустит в  пыли,
Страницы старые  тихонько разверни...
Себе в них открываю целый мир –
В них мудрости волшебный элексир.



[www.pisateli.by](http://www.pisateli.by)

**Рубрыка «Зялёны радок»**
**(дзіцячая творчасць)**